Спампавана з сайта Аверсэв

Дзеепрыметнік разам з залежнымі ад яго словамі называецца **дзеепрыметнікавым зваротам**. Ён з'яўляецца адным членам сказа — развітым азначэннем: *Радасна зямлю прабіла рунь, веснавым абуджаная громам* (Р. Барадулін).

**Дзеепрыметнікавы зварот**




Калі дзеепрыметнікавы зварот стаіць перад паяснёным ім словам, то ў вусным маўленні ён не выдзяляецца паўзамі і на пісьме не адасабляецца: | *Парослая высокай травой* | *сцяжынка* *вяла да самай леснічоўкі.*

Дзеепрыметнікавы зварот, які стаіць пасля паяснёнага ім слова, выдзяляецца ў маўленні паўзамі. Пры гэтым слова, якое паясняецца дзеепрыметнікавым зваротам, звычайна вымаўляецца з павышэннем тону. На пісьме дзеепрыметнікавы зварот адасабляецца коскай: *З ваколіцы была добра відаць наша* *школа*, | *размешчаная на ўскрайку мястэчка* | (І. Навуменка).

Калі дзеепрыметнікавы зварот стаіць пасля паяснёнага ім назоўніка і знаходзіцца ў сярэдзіне сказа, то выдзяляецца з двух бакоў коскамі: *Сонца*, | *ахутанае шэраю смугою* |, *няспела ўставала з-за лесу* (П. Броўка).